УДК 821.161.3

***З.П. Мельнікава***
*д-р філал. навук, праф., праф. каф. беларускай філалогіі*
*Брэсцкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А.С. Пушкіна*
e-mail: pralih@mail.ru

# УМЕЦЬ ЖЫЦЬ ДУХАМ: ЭТЫЧНА-КАШТОЎНАСНАЕ МЫСЛЕННЕ ПІСЬМЕННІКА ЯНКІ БРЫЛЯ І ЛІТАРАТУРАЗНАЎЦЫ УЛАДЗІМІРА КАЛЕСНІКА

*Прадстаўлены маральна-філасофскія, этычныя, чалавеказнаўчыя ідэі творчасці вядомых беларускіх пісьменнікаў Я. Брыля і У. Калесніка. Аргументуецца, што ў 80–90-я гг. XX стагоддзя абодва звярнуліся да аксіялагічнага асэнсавання чалавечага і грамадскага быцця і прызначэння літаратуры. У час абясцэньвання нацыянальных, народных і агульначалавечых культурных традыцый, дэскрэдытацыі сацыяльна-ідэалагічных асноў грамадства яны паслядоўна сцвярджалі гуманістычныя каштоўнасці. Тэксты пісьменнікаў-мысляроў Я. Брыля і У. Калесніка ўказанага перыяду нагадваюць філасофскі дыялог і ўтрымліваюць сістэму маральна-этычных, нацыянальна-патрыятычных, хрысціянскіх ідэй. Беларускасць, адчуванне роднай зямлі, народа і мовы абодва творцы лічылі «стрыжнем асобы, чалавечаю нормай», а крытэрыем змястоўнасці жыцця – ступень далучанасці асобы праз нацыянальнае да сусветнага гуманістычнага кантэксту чалавецтва.*

У нашы дні высока ацэньваецца ўклад народнага пісьменніка Янкі Брыля ў развіццё беларускай літаратуры XX ст., у творчае абнаўленне ім жанраў нацыянальнай лірыка-філасофскай прозы. Асабліва выразна гэта ўбачылася падчас святкавання стогадовага юбілею (4 жніўня 2017 г.). Разам з тым філолагі, настаўнікі, літаратары канстатуюць, што сучасных навуковых даследаванняў, прысвечаных цэласнаму і сістэмнаму асэнсаванню гэтага непаўторнага творцы ўсё яшчэ не з’явілася. Магчыма, таму, што напісанае Я. Брылём, асабліва ў апошнія дзесяцігоддзі, – гэта ў пэўным сэнсе элітарная, інтэлектуальная проза, асабліва лірычныя мініяцюры, замалёўкі, лірыка-філасофскія эсэ, надрукаваныя дзённікавыя запісы. Яны сведчаць аб тым, што пісьменнік не проста любіў і цаніў жыццё ва ўсіх яго праявах, але і глыбока раздумваў над ім як мастак-мысляр, ацэньваў чалавека і грамадства, кіруючыся найперш высокімі маральнымі і філасофска-гуманістычнымі крытэрыямі. Такой якасці літаратурны матэрыял патрабуе і адпаведных высокаякасных навукова-інтэрпрэтацыйных падыходаў, і асабістага эстэтычна-інтэлектуальнага ўзроўню чытача і інтэрпрэтатара.

У чаканні новых «прачытанняў» творчасці гэтага адметнага класіка асабліва выразна бачыцца значнасць і непераўзыдзенасць літаратуразнаўчых прац У. Калесніка, які быў і па сённяшні дзень застаецца найарыгінальнейшым і аўтарытэтным даследчыкам творчасці Я. Брыля. Гэтаму спрыяла іх шматгадовае сяброўства, глыбокае ўзаемаразуменне. За радкамі У. Калесніка пра творчасць сябра не толькі бачыцца талент філасофска-даследчыцкага пранікнення крытыка ў мастацкае выказванне Я. Брыля, але выразна чуецца дыялог двух мысляроў, двух эстэтыкаў, інтэлектуалаў-творцаў. Яны сапраўды мелі шмат агульнага і ў асабістых лёсах. Абодва «заходнікі», землякі, узгадаваныя ў шчодрым Наднямонні: Я. Брыль на паэтычнай Навагрудчыне, У. Калеснік на Карэліччыне, што зусім побач, а гэта вызначала і значнае ментальнае падабенства. Да таго ж абодва прайшлі праз вайну з фашызмам, кожны – сваім драматычным шляхам. А потым яны і А. Адамовіч са старонак кнігі «Я з вогненнай вёскі…» паказалі свету палаючую Беларусь і жыцці ні ў чым не павінных людзей, чым прымусілі людзей розных краін задумацца над вытокамі фашызму і прычынамі дзікага чалавеканенавісніцтва.

І Я. Брыль, і У. Калеснік былі «арыстакратамі духу» – людзьмі надзвычайнай начытанасці, абазнанасці не толькі ў літаратуры, але і ў гісторыі, філасофіі, эстэтыцы, жывапісе. Для нас, маладзейшых, яшчэ пры іх жыцці яны самі былі сапраўднай гісторыяй беларускасці, нязломнасці беларускага духу. І кожны з іх – адметная, духоўна багатая асоба. Іх сяброўства – гэта дыялог двух вялікіх людзей, які доўжыўся больш за чатыры дзесяцігоддзі пры іх жыцці. А сёння гэты змястоўны дыялог працягваецца са старонак іх кніг.

Яны былі ўдзячныя адзін аднаму за шчодрую чалавечую і творчую ўзаемнасць. Смуткуючы пасля адыходу У. Калесніка, Я. Брыль згадваў, што часта яму было прыемна згаджацца з сябрам, цікава і спрачацца, *«як гэта ў нас бывала... над ягоным ці маім рукапісам, а то і задаволена смяяцца па-нашаму, як шчаслівыя юнакі... Мне пашчасціла разам з ім нямала павандраваць і па нашых родных мясцінах, і па прасторах ад Белавежы да Прыпяці. Ён, як дамоў, запрашаў мяне на сустрэчы са сваімі студэнтамі і сябрамі-пісьменнікамі “Берасцейскага вогнішча”»* [1, с. 5]. Я. Брыль цаніў і любіў свайго старэйшага сябра, паплечніка ў службе роднаму слову, з пашанай і сумам пісаў пра гэта ў прадмове да кнігі «ўспамінальнай прозы» У. Калесніка «Доўг памяці».

Думаецца, што найперш Я. Брыля і У. Калесніка яднала беларускасць, якую абодва лічылі «стрыжнем асобы, чалавечаю нормай». Я. Брыль, у прыватнасці, пісаў: *«Гэта нармальна, што яно ў мяне ёсць, было і будзе – адчуванне роднай зямлі, народа, мовы, – нягледзячы ні на што»* [2, с. 140]. У. Калеснік, задумаўшыся над выказваннем сябра, уступаў у дыялог з пісьменнікам і прадаўжаў ужо ад сябе разгортваць гэтую маральна-філасофскую тэму: *«Так, гэта нармальна ў прынцыпе, але жыццё несла так многа адхіленняў, якія станавіліся насланнём, бядою, што не раз пхала нас, беларусаў, да нацыянальнага нябыту. На шчасце, норма, захаваная дужэйшымі сярод нас, вярта-ла на шлях адраджэння ўсіх»* [3, с. 164].

Дыялогам пісьменніка і крытыка ўяўляецца ўсё, напісанае У. Калеснікам аб творчасці Я. Брыля. Найперш гэта кніга «Янка Брыль: Нарыс жыцця і творчасці» [5]. Несумненна, што гэта даследчыцкая праца – адна з лепшых кніг падобнага жанру ў беларускім літаратуразнаўстве. Яна з’яўляецца ўзорам не толькі глыбокага досведу аўтара па абранай тэме, але і высокай эстэтычнай густоўнасці, высокапрафесійнай чуйнасці даследчыка да кожнай дэталі як у жыцці, так і ў творчасці мастака слова, узорнай і ў плане бездакорнасці абраных навукова-метадалагічных падыходаў.

Кніга пра Янку Брыля, як і іншыя працы У. Калесніка, убірае багаты жыццёвы, маральна-этычны і духоўны вопыт не толькі пісьменніка Я. Брыля, але і самога даследчыка, выдатнага літаратара. Асэнсаванне жыццёвага шляху пісьменніка і яго мастацкай творчасці тут дапоўнена асабістым бачаннем жыцця У. Калесніка, што ўтварае згарманізаваны, больш, чым літаратуразнаўчы, чалавеказнаўчы сінтэтычны дыскурс, які ўспрымаецца значна шырэй за жанравае вызначэнне «нарыс жыцця і творчасці».

Па нашым перакананні, У. Калеснік, даючы навуковую інтэрпрэтацыю творам Я. Брыля, распрацоўваў і плённа карыстаўся арыгінальнай філасофска-эстэтычнай, па сутнасці, *аксіялагічнай метадалогіяй* аналізу мастацкага твора і ўвогуле творчасці пісьменніка. У аснову яе пакладзена сістэма агульначалавечых гуманістычных каштоўнасцей, сярод якіх вызначальнае месца адводзіцца нацыянальна-патрыятычным крытэрыям. Прамым сведчаннем гэтаму з’яўляюцца высновы У. Калесніка аб сістэме аксіялагічных каштоўнасцей, этычна-каштоўнасным мысленні, ужыванне тэрміна «аксіялагізаваны стыль» у адносінах да асаблівасцей творчай манеры Я. Брыля.

Для беларускага літаратуразнаўства, якое і ў 1990-я гг. заставалася дастаткова інертным, такая метадалогія была наватарскай. У. Калеснік сыходзіў найперш з сістэмы вечных агульналюдскіх каштоўнасцей, ці, інакш, аксіялагічных прынцыпаў. Аксіялогія – гэта тэорыя каштоўнасцей, філасофскае вучэнне аб прыродзе і паходжанні каштоўнасцей, іх месцы ў грамадстве, аб сувязі і ўзаемадзеянні розных каштоўнасцей і іх сістэм між сабой, аб іх уплыве на сацыяльныя і культурныя фактары грамадскага жыцця і на светапогляд асобы. Аксіялогія як навука аб каштоўнасцях, паводле сцверджанняў філосафаў, паходзіць ад Сакрата і яго заўжды надзённага пытання: «Что есть благо?» У поўным аб'ёме, у яе сэнсава-выяўленчай выніковасці, у сукупнасці яе мажлівасцей як сістэмнага даследчага накірунка аксіялагічная метадалогія застаецца недастаткова засвоенай і рэалізаванай літаратуразнаўствам і па сённяшні дзень.

Агульнавядома, што праблема каштоўнасцей паўстае непазбежна ў час абясцэньвання нацыянальных і агульначалавечых культурных традыцый, дыскрэдытацыі ідэалагічных асноў грамадства. У гэтую філасофскую аксіёму, несумненна, укладваецца сацыякультурная харктарыстыка апошніх дзесяцігоддзяў XX ст., што абумовіла зварот эстэтычна чуйных, сумленных даследчыкаў-мысляроў да духоўных каштоўнасцей нацыі і чалавецтва, у тым ліку і зварот літаратуразнаўства да пераасэнсавання мастацкіх здабыткаў беларускай літаратуры, да выяўлення ў нашай нацыянальнай духоўнай спадчыне яе філасофска-гуманістычнага зместу і гучання. У ліку такіх даследчыкаў-літаратуразнаўцаў быў У. Калеснік.

Усё часцей да аксіялагічных вартасцей чалавецтва мы мусім звяртацца следам за У. Калеснікам менавіта сёння, калі наша быццё, існаванне раздвоены: з аднаго боку, рэальнасць, часта жорткая, цынічна паніжаючая чалавечую самакаштоўнасць і годнасць, і, з другога боку, сістэма каштоўнасцей, духоўных, маральна-этычных, хрысціянскіх, агульнагуманістычных, як аб'ект памкненняў асобы, як імкненне да магчымасці кожнаму з нас рэалізаваць сябе ў каштоўнаснай сістэме быцця і асобаснага існавання. Хіба не аб гэтым словы У. Калесніка: *«Сумленнае выкананне абавязку маральна ўраўноўвае таленавітых і сярэдніх, радавых працаўнікоў літаратуры, адсюль паўстае ўніверсальная дыфініцыя каштоўнасці чалавечага жыцця?»* [2, с. 237]. Так піша даследчык, асэнсоўваючы лірыка-філасофскія мініяцюры Я. Брыля з кнігі «Сёння і памяць» аб працавітасці сціплых пісьменнікаў мінулага, якія могуць быць вартым прыкладам для сённяшніх праз меру амбітных творцаў пачатку XXI ст., якія ўяўляюць сябе «жывымі класікамі».

Грунтуючыся на сістэме аксіялагічных каштоўнасцей, У. Калеснік прачытвае і інтэрпрэтуе кароткія творы Я. Брыля, у якіх пісьменнік разважае над сэнсам быцця чалавека. Назіранні і роздумы сябра выклікаюць даследчыка на дыялог. У. Калеснік, падхопліваючы думку Я. Брыля аб тым, што чалавеку ў сталым узросце патрэбна *«мужна падрыхтавацца да адыходу. Пакінуўшы толькі патрэбнае»* [4, с. 259], у прыватнасці, пісаў: *«Сэнс быцця. Калі б можна было ахапіць яго і выказаць адным словам, адным афарызмам ці вобразам, ён перастаў бы быць вечным пытаннем. Жыццё наша страціла б сваю прывабную загадкавасць, як траціць яно прывабнасць для тых, хто не шукае сэнсу, згаджаецца проста жыць як набяжыць. Жыццё ў момант адкрывання сэнсу як бы спыняецца, але ж адкрыты не ўвесь сэнс, а толькі часовы, і жыццё рухаецца далей, вабіць нас вечная дзея і вечныя рухі яго сэнсу і мэты… Найбольш цяжкі выпадак спрашчэння сэнсу жыцця – гэта бездухоўнасць, біялагізацыя, што зводзіць жыццё чалавека да сытасці, камфорту, кар'еры, спажывання матэрыі свету»* [5, с. 237–238].

Я. Брыль і У. Калеснік аспрэчвалі перавагу сацыяльнага над духоўным, лічылі гэта састарэлым параметрам ацэнкі духоўнага росту асобы незалежна ад таго, ці ідзе гаворка пра рэальнага чалавека, ці пра літаратурнага героя. *«Знешнія ўмовы не дзейнічаюць на чалавека аўтаматычна»*, – зазначае даследчык у гаворцы пра Алеся Руневіча, біяграфічнага героя рамана Я. Брыля «Птушкі і гнёзды». І далей піша: *«Ён свядома і паслядоўна пераходзіў ад маральна-духоўнага непрыняцця фашызму як сістэмы эстэтычных антыкаштоўнасцей да непрыняцця яго і як сістэмы сацыяна-палітычнай, варожай інтарэсам нямецкага народа і іншых народаў свету, у тым ліку і свайго, беларускага. Такое развіццё асобы не патрабуе змены арыенціраў, а толькі ўзбагачэння іх, дапаўнення сістэмы маральных каштоўнасцей… прагрэсіўна-сацыяльнае не канфліктуе з маральным, а дапаўняе яго»* [5, с. 200].

Адштурхоўваючыся ад лёсу аўтабіяграфічнага брылёўскага героя-шукальніка, У. Калеснік таксама ўздымаецца на вышыню філасофскіх разваг аб умовах духоўнага росту асобы, аб ролі самаразвіцця і самаўдасканалення, аб уплыве грамадскіх абставін у «ачалавечванні» чалавека: *«Проста чалавека робяць Чалавекам не толькі абставіны, але перадусім ён сам сябе лепіць, абставіны ж толькі спрыяюць ці шкодзяць яму, аблягчаюць ці стрымліваюць рост, яны не прадвызначаюць вынікаў»* [5, с. 200–201].

Гэтыя глыбокія філасофскія і чалавеказнаўчыя высновы У. Калесніка ўяўляюць прынцыповую важнасць пры ацэнцы характараў, учынкаў як рэальных людзей, так і літаратурных герояў.

Даследуючы жыццядзейнасць літаратурных герояў Я. Брыля, У. Калеснік размяжоўваў нават духоўныя і светапоглядныя арыенціры, хоць, на першы погляд, яны могуць здацца калі не тоеснымі, то сінанімічнымі. Так, напрыклад, літаратуразнаўца сцвярджае, што маці, гераіня аднайменнага апавядання Я. Брыля, кіруецца найперш і менавіта духоўнымі арыенцірамі, здзяйсняючы свой подзвіг ратавання чужых сыноў. Умець жыць духам, чуласцю сэрца, чысцінёй сумлення, кіравацца традыцыйнай спаконвечнай народнай этыкай – гэта і ёсць паказчык далучанасці чалавека, героя твора, ці нас, жывых і рэальных, да высокіх каштоўнасцей. Да гэтых крытэрыяў даследчык далучае здольнасць асобы да этычна-каштоўнаснага мыслення, што дае чалавеку вышыню і мудрасць у яго разуменні сэнсу жыцця як дабра для ўсіх людзей.

Разам і побач з пісьменнікам-мастаком Я. Брылём літаратуразнаўца даследуе праблему каштоўнасцей у жыцці чалавека на вайне. Тут, бясспрэчна, бярэцца пад улік не толькі апасродкаваны вопыт мастацкай літаратуры, але і асабісты, непасрэдны вопыт партызана, падрыўніка, кулямётчыка, камандзіра ўзвода Калесніка. Даследчык лічыць, што *«асноўная прычына панікёрскага настрою, які штурхае баязліўцаў да маральнага ўпадку»*, – гэта *«падуладнасць інстынкту»*. Паніка, абгрунтоўвае гэту думку У. Калеснік, небяспечна тым, што часова пазбаўляе чалавека ідэйных арыенціраў, асляпляе, даводзіць да здрады сябрам і справе. *«Вартаснасць учынкаў і паводзін чалавека на вайне вызначалася перамогай патрыятычнай і чалавечай годнасці над інстынктам самазахавання, узвышэннем каштоўнасцей духа над дыктатам цела, вызваленнем высокага і яго дамінаваннем над жывёльным у чалавеку»* [5, с. 160].

Аналізуючы творы Я. Брыля «Адзін дзень», «Маці», «Memento mori», даследчык пераканаўча абгрунтоўвае «псіхалогію жаху» на вайне. З гуманістычных каштоўнасных пазіцый асэнсоўваюцца ім некаторыя аспекты вялікай тэмы трагічнага гучання – дзеці і вайна. Нараджэнне дзіцяці ў партызанах, у пекле блакады было небяспечнай падзеяй для астатніх. У. Калеснік пра гэта піша: *«Вайна стварае маральна-псіхалагічную анамалію: дзіця, малечу, якое чалавецтва нават генетычна звыкла любіць і аберагаць*

*як сваю радасць і надзею, раптам становіцца пасланцом бяды, абуджае да сябе не любоў і ласку, а страх. Страх напускае на ўвесь белы свет вайна, ён прыстае перадусім да істот бездапаможных. Вайна змяняе іх каштоўнаснае значэнне для дарослых, не дае стаць любімымі, гоніць у страхотлівае царства нябыту, туды, адкуль выйшлі гэтыя неіснаваўшыя, не паспеўшыя ачалавечыцца істоты»* [5, с. 140].

Даследуючы творы Я. Брыля, іх вобразную, сюжэтную, кампазіцыйную сістэмы, літаратуразнаўца ацэньвае іх вартасць у сферы выяўлення высокіх каштоўнасцей і сімволікі. Ён актыўна ўводзіць у метадалогію аналізу багаты агульнагуманістычны кантэкст, які ўтвораны з важных духоўных каштоўнасцей чалавецтва. Аб гэтым сведчаць звароты вучонага ў кнізе пра Я. Брыля да асоб Арыстоцеля, Сакрата, Сенекі, Нерона, Мантэня, Талстога, Чэхава і многіх іншых мастацка-філасофскіх аўтарытэтаў чалавецтва. Тонкае адчуванне мастацкага матэрыялу, дасканалы даследчыцкі густ, markdown разнабаковая інтэлектуальная дасведчанасць У. Калесніка выяўляліся ў глыбіні і пераканаўчасці яго назіранняў і высноў. Вось, напрыклад, як ёміста і дакладна вызначае аўтар сэнсавае багацце і ідэйную сутнасць апавядання Я. Брыля «Маці»: *«Ідэйная выснова, якую робіш ад уражання твора, гучыць прыкладна так: людзі, скалечаныя прагавітасцю, не ўмеюць спачуваць, дапамагаць слабейшым, смуткаваць аб памёршых, захоўваць годнасць чалавека, яны ніжэй трагізму і камізму, яны – бруд, яны зло»* [5, с. 156].

Аналізуючы творы, разважаючы пра брылёўскіх літаратурных герояў, У. Калеснік умеў далікатна, тактоўна і разам з тым прынцыпова выказаць свае ацэначныя, узважаныя адносіны да жыцця і пэўных грамадска-сацыяльных падзей. Так, гаворачы пра героя аповесці Я. Брыля «Сірочы хлеб» Міколу Кужалевіча і настаўніцу панну Мар’ю, даследчык падае і свае ацэнкі – маральныя імператывы – героям і гістарычным падзеям, удакладняе разуменне гуманістычнага і дыялектычную суаднесенасць грамадска-філасофскіх катэгорый «нацыянальнае – сацыяльнае – гуманістычнае». Вось як даследчык аб гэтым выказаўся: *«Сацыяльна-класавы і гуманістычны спосабы ацэначнай арыентацыі ў сферы грамадскіх з’яў збліжаюцца, бо працоўна-класавае, народнае з’яўляецца і агульначалавечым, рэальна гуманістычным. Сваёю роднасцю з агульначалавечым дужы і высакародны вызваленчы рух і яго ідэал»* [5, с. 95].

Выдатнай з’явай айчыннага літаратуразнаўства стаў і раздзел, прысвечаны аксіялагічнай, маральна-філасофскай інтэрпрэтацыі лірычных мініяцюр Я. Брыля «Усё чалавечае», з апошняй Калеснікавай кнігі з той жа назвай. Менавіта У. Калеснік, як ніхто іншы з літаратуразнаўцаў, пранікліва і сістэмна спасціг сутнасць брылёўскай мініяцюры, назваў іх адметным «архіпелагам» нацыянальнай літаратуры.

Жанр гаворкі-роздуму пісьменніка з сабой і з усімі, з прыродай, жыццём і светам прыйшоў у творчасць Я. Брыля яшчэ ў 1950-я гг. Думаецца, што не без самапрызнання пісьменніка крытык У. Калеснік назваў мініяцюры Я. Брыля (як, дарэчы, і некаторых іншых тагачасных беларускіх і ўвогуле савецкіх пісьменнікаў) *«формай барацьбы за свабоду творчасці ва ўмовах ідэалагічнага аўтарытарызму і рэгламентацыі творчага працэсу»* [3, с. 165]. І сапраўды, менавіта глытком свежага паветра ў беларускай літаратуры яны былі ў пасляваенныя і застойныя гады, калі, па трапным вызначэнні У. Калесніка, уся беларуская і савецкая духоўная прастора *«была засмечана ідэалагічным пустазеллем»*. Менавіта тады Я. Брыль *«насуперак стандартам, склаў падборку колішніх сваіх шчырых нататак, каб вызваліцца з творчага прастою, да якога давялі выдавецкія ментары»* [3, с. 167].

У. Калеснік, як вельмі нямногія даследчыкі, убачыў *«эстэтычна-выяўленчую закончанасць, самастойнасць і самацэннасць»* мініяцюр Я. Брыля ў той час, як некаторыя калегі-пісьменнікі іранізавалі, што кніга мініяцюр – нішто ў параўнанні з раманам, што мініяцюры не адпавядаюць мажной постаці іх аўтара… Вылучаючы высокую мастацкую вартасць Брылёвых мініяцюр, У. Калеснік пераконваў: яны нешта большае і іншае, чым дзённікавыя запісы, чым сучасная еўрапейская авангардысцкая проза; гэта не мазкі імпрэсіяніста на палатне і *«не сімвалісцкія таемныя знакі… Цыклы мініяцюр і кнігі мініяцюр – гэта сітэма аб'яднаных гуманістычнаю ідэяй вобразаў і думак, афарызмаў і парадоксаў, назіранняў і выказванняў аб людзях і свеце, аб надзённым і вечным, аб чалавеку, яго мажлівасцях і немагаце»* [3, с. 167].

У. Калеснік трапна асэнсоўваў сутнасць брылёўскага падыходу ў гэтым жанры да асобы чалавека як *«змястоўную адзіноту»*, як сітуацыю медытацыі і самаацэнкі. Абодва пагаджаліся, што чалавек становіцца індывідуальнасцю ў калектыве, дзе кожны мае магчымасць *«адчуваць сябе суб'ектам, якога за нешта любяць, а за нешта асуджаюць… Калектыў, як і самота, могуць шкодзіць індывідуальнасці і спрыяць… Калектывізм і індывідуалізм – падобна як і ўласнасць: нажытая сумленна выхоўвае, а накрадзеная – дэмаралізуе…»* [3, с. 166].

Пісьменнік Я. Брыль, па слушным меркаванні У. Калесніка, быў *«вельмі чулы да грамадскай і жыццёвай каштоўнасці чалавечых схільнасцяў»*, таму яго ацэнкі паводзін людзей даюцца *«паводле гуманістычнай стваральнай этыкі» і «выключна брылёўскай “саборнасці”»* [3, с. 166] ўспрымання свету. У сваіх даследаваннях творчасці сябра У. Калеснік паслядоўна і аргументавана прадставіў Я. Брыля ідэйным паслядоўнікам і вучнем вялікіх пісьменнікаў XIX ст. Л. Талстога і А. Чэхава. Адначасова даследчык выказаў, несумненна, слушнае меркаванне аб «еўрапейскасці» творчай постаці Я. Брыля, якая засведчана моцным гучаннем *«агульначалавечых быційных праблем і глабальных пытанняў сучаснасці»*, гэта значыць таго, што грамадская думка назвала ў 80-я гг. мінулага стагоддзя «новым мысленнем».

Літаратары, даследчыкі творчасці Я. Брыля і ўсёй нацыянальнай літаратуры ў будучыні, як і ў нашы дні, абавязкова будуць пранікліва ўчытвацца ў глыбокія калеснікаўскія развагі аб сямейных і маральна-духоўных вытоках творчасці народнага пісьменніка Беларусі, будуць захапляцца праніклівасцю, трапнасцю і афарыстычнасцю думак і выказванняў У. Калесніка аб творах Я. Брыля розных жанраў. Самыя дапытлівыя і ўдумлівыя знойдуць у высновах даследчыка перспектыву да новых даследчыцкіх падыходаў, падказкі да абноўленага прачытання брылёўскай прозы – стылёва сінтэтычнай, філасофскай, лірыка-аналітычнай. Пісьменнік у творчай працы ўбачыў сэнс жыцця – жыць для людзей, быць «сувязным» паміж сваім народам і духоўнымі каштоўнасцямі чалавецтва.

Заўсёды будуць актуальныя маральна-філасофскія запаветы Я. Брыля аб неабходнасці памятаць, што жыццё дадзена адзін толькі раз, што нельга жыць як на вакзале: абы хутчэй прайшоў час; кожны з нас павінен ведаць свой цягнік і паспець на яго сесці; неабходна шанаваць і берагчы жыццё ва ўсіх яго праявах, жыць змястоўна… Разважаючы пра сэнс быцця, пісьменнік неаднойчы падкрэсліваў часовасць, абмежаванасць чалавечага жыцця на зямлі. Пры гэтым Я. Брыль заўважаў: *«Часовасць гэтую разумеюць па-свойму і мудрасць і дурнота. Адна стараецца насыціць яе, часовасць, мудрым зместам, а другая – схапіць хоць што»* [6, с. 39]. А вось як інтэрпрэтуе і дапаўняе сябра ў філасофскім дыялозе У. Калеснік: *«Напоўніць увесь свой кароткі ці доўгі век мудрым зместам – значыць забяспечыць сабе месца на тым дыване-самалёце, які на-*

*зываецца час чалавечы, каб не забылася твая прысутнасць у свеце, каб помнілася зробленае для людзей…*

*Творчасць – гэта і ёсць спосаб на несмяротнасць, але несмяротнасць не можа быць адзіным і галоўным стымулам літаратурнай працы. Стымулам больш глыбокім з'яўляецца ўсведамленне свайго ўдзелу ў літаратуры, якая нясе праўду аб жыцці, яго ідэалах, мэтах.*

*Каб пражываць змястоўна ўласнае адзінкавае жыццё, чалавеку патрэбна далучыцца да жыцця зборнага, грамадскага, сваяцкага, сяброўскага, нацыянальнага, агульначалавечага. Менавіта ў кантэксце жыцця ўсяго чалавецтва, якому няма канца, асоба можа пазнаць самую сябе, знайсці сваю мэту… Жыць для людзей, дзеля іх шчасця, прыносіць радасць творамі – усе гэтыя ідэі сваціл Я. Брылю з юнацтва»* [3, с. 173–174].

Я. Брыль раіў сабе і ўсім, каму цікава, прыслухацца да яго вопыту: *«Мітусіцца не трэба, трэба аберагаць свой час, заўсёды, штодня нацэльвацца на галоўнае, зноў і зноў вучыцца… Трэба ўмець радавацца чужому поспеху. Думаючы пра поспех роднай літаратуры. Трэба… увесь час вучыцца гэтай радасці… сціпласці, адчуванню абавязку»* [4, с. 288].

Няма сумненняў, што неаднойчы Я. Брыль і У. Калеснік уступалі і ў вусныя сяброўскія філасофскія дыялогі аб сэнсе жыцця, супастаўлялі меркаванні аб гэтым ідэалістаў і матэрыялістаў. І абодва пагаджаліся, што цалкам сэнс жыцця не спасцігнуты ні першымі, ні другімі, і, думаецца, абодва адчувалі пэўную радасць ад яго неспазнавальнай глыбіні. Вось як аб гэтым сведчыць У. Калеснік: *«Я. Брыль ведае людзей, якія пэўныя, што маюць канчатковую формулу сэнсу жыцця. На жаль, чым больш самаўпэўненасці ў гэтых людзей, тым больш беднасці, банальнасці ў іх формулах. Найбольш цяжкія выпадкі зніжэння сэнсу жыцця – гэта бездухоўнасць, звядзенне жыцця да клопату пра сытасць, камфорт, кар'еру.*

*Я. Брыль вядзе зацятую барацьбу з бездухоўнасцю і вульгарнай апушчанасцю, трыбушною люмпенізацыяй, бо чалавеку ўласціва прага духоўнасці і патрэба сцвярджаць сябе добрымі справамі, дасягаць этычнай чысціні кожнага дня, кожнага кроку… Яго назіранні і роздумы – прыклад спажыткоўвання здабыткаў уласнага і агульналюдскога духу для пераўтварэння чалавека ў Чалавека»* [3, с. 175].

Як бачым, творчы дыялог гэтых сапраўды вялікіх, мацнейшых сярод нас сваім духам людзей дазволіў сфармуляваць ужо вядомыя калеснікаўскія філасафізмы: творчасць – гэта спосаб на несмяротнасць; нельга бязмэтна спажываць матэрыю свету, неабходна жыць, каб пасля помнілася твая прысутнасць у свеце.

І Я. Брыль, і У. Калеснік пакінулі нам мудрыя і мужныя парады, як варта жыць у маладым узросце і на апошнім этапе, калі чалавек набліжаецца да непазбежнага. Сапраўды, кожнаму варта і неабходна павучыцца ў іх здольнасці парадкаваць уласную душу штодзень: не паддавацца плебейскай псіхалогіі самасуяў, пераадольваць зло ў сабе. Маральны самакантроль і гуманістычная самаарыентацыя, як падказваюць сёння са старонак сваіх кніг Я. Брыль і У. Калеснік, дапамагаюць кожнаму, і найперш маладому, удумліваму, чалавеку знайсці месца ў агульначалавечай справе.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Калеснік, У. Доўг памяці / У. Калеснік. – Брэст : Брэсц. друк., 2005. – 548 с.
2. Брыль, Я. На сцежцы – дзеці / Я. Брыль. – Мінск : Маст. літ., 1988. – 234 с.

3. Калеснік, У. Усё чалавечае : літ. партрэты, арт., нарысы / У. Калеснік. – Мінск : Маст. літ., 1993. – 381 с.

4. Брыль, Я. Сёння і памяць : апавяданні, мініяцюры, эсэ / Я. Брыль. – Мінск : Маст. літ., 1985. – 317 с.

5. Калеснік, У. Янка Брыль : нарыс жыцця і творчасці / У. Калеснік. – Мінск : Нар. асвета, 1990. – 265 с.

6. Брыль, Я. Збор твораў : у 5 т. / Я. Брыль. – Мінск : Маст. літ., 1979–1981. – Т. 5. – 1981. – 408 с.

Рукапіс паступіў у рэдакцыю 09.10.2017

***Melnikava Z.P.*** **To be Able to Live by the Spirit: Ethics and Value Thinking of the Writer Yanka Bryl and Literary Critic Uladzimir Kalesnik**

*The article presents the moral-philosophical, ethical, human ideas on the work of famous Belarusian writers Ya. Bryl and Uladzimir Kalesnik. It's argued that in the 80–90s of the last century, both turned to axiological understanding of human and social existence and purpose of literature. During the depreciation of the national, folk and universal cultural traditions, discredit of socio-ideological foundations of society they have consistently claimed humanitarian values. The texts of writers and thinkers Ya. Bryl and U. Kalesnik in the specified period resemble a philosophical dialogue and contain a system of moral and ethical, national-patriotic, and Christian ideas. Both creators considered the feeling of the native land, people and language, to be «the pivot of personality, the human norm», and the criterion of meaningfulness of life – the degree of involvement of the individual through national to global humanistic context of humanity.*